* * *

Пры праведзеньні камасацыі на нашых вёсках урад дбае толькі аб тым, каб зямлю перакроіць з шнуроў у адзін кусок і аддаць яго селяніну. Падбаць-жа, каб на тым куску была, як сьлед, заведзена гаспадарка, каб далей селянін устаў на ногі і вырваўся з тэй с.-гаспадарчай цемры ён ня дбае. Тут мусіма прызнаць, што да вайны куды лепшыя да сялян былі адносіны царскага ўраду, праводзячага Сталыпінскую рэформу. Тагочасныя землеўстройствы лепш разумелі патрэбы дробнага сялянства і стараліся яму даць фаховую помач г. т.-зв. аграномаў і другіх спэцыялістаў. Цяпер таго няма. Грошы, якія ўрад кідае на помач земляробу т. з Крэсаў да таго малыя, што і сьмех сказаць, тым болей яны не прадукцыўна трацяцца, бо дзеляцца паміж розных установаў, а тыя найчасьцей іх ужываюць на правядзеньне сваіх палітычных плянаў і на ўтрыманьне ўсялякіх палітыкмахэраў, а не фахоўцаў.

Есьць у нас і розныя „Кулкі“ і „Товажыствы“, аднак 95 проц. іх работы зводзяцца на пісаньне паперкаў і ўтрыманьне штатаў канцэлярыстаў. У вёсках працуюць і то рэдка аграномы соймікаў, калі ў іх сяляне дадумаліся ўстанавіць гэтакія штаты. Тыя аграномы, калі толькі гэтыя людзі тутэйшыя, усю працу дзеля паляпшэньня долі земляроба і вядуць ды няраз скардзяцца, што часта выяжджаць на вёскі ня могуць дзеля таго, што іх закідаюць розныя ўжэнды і кіраўніцтвы папяровай работай. А пры правядзеньні камасацыі помач аграномаў вёскам нашым вельмі і вельмі патрэбныя. Аграном такі павінен ужо разам з землямерам укладаць камасацыйны плян, далей павінен у працягу камасацыйных работ вясьці з сялянамі гутаркі, як трэба загаспадараваць свае новыя ўчасткі, як пабудавацца і г. п. і пасьля ён-жа павінен улажыць для новых гаспадарак севазвароты. Добра ведама, што добра ўложаныя севазвароты будуць вехамі ў вызначэньні належных кірункаў вытворчасьці с.-гаспадарак.

Ня лёгка будзеісьці гэта работа працаўнікам-аграномам, прыдзецца ім прабіваць лбом, як кажуць, сьцены, але ўсеж-такі знойдзецца з пару рупнейшых гаспадароў-культурнікаў, што аграномаў паслухаюць і тады мала па малу ўся вёска пойдзе іх сьлядамі.

І вось трэба нам усім, дзе толькі можам ў валасьцях на сходах, у сойміках на зьездах, ды на паседжаньнях Сойму дабівацца ўвядзеньня фаховых с.-гаспадарскіх працаўнікоў у вёскі, дзеля рэальнай помачы гаспадару, тым болей у вёскі скамасованныя, бо інакш без агранамічнай помачы мы сяляне яшчэ на некалькі дзесяткаў гадоў спозьнім сваё эканамічнае адраджэньне, а з ім і свой дабрабыт. Хай аграном будзе так неабходным у вёсцы, як лекар, вэтэрынар, ды аптэкар.

Г. Рэго.

Здабываньне зялёнага корму ў гаспадарцы.

Кожны гаспадар запасае корм на зіму. Дзеля гэтага ён сее канюшыну, павялічвае плошчу бульбы, а іншы сее і корняплоды.

Нажаль, гаспадары мала забясьпечваюць гаспадарку зяленым кормам на лета.

А між тым, у большасьці мясцовасьцяй жывёла і летам патрабуе корму з рук. Добрага выгану ў нас амаль зусім няма, плошча пад імі што-год зьмяншаецца, ды й трава мала спажыўная.

Селянін бачыць, што скаціна не даядае, каровы збаўляюць удоі малака. Трэба паклапаціцца, каб забясьпечыць жывёлу зялёным кормам і летам. Рабіць гэта абавязкова патрэбна.

Добрым і найбольш вядомым зялёным кормам зьяўляецца мяшанка яравой выкі з аўсом. Мяшанку гэту можна сеяць у папары. Глеба пад яе рыхтуецца з восені Пасьля ўборкі аўсу, за якім звычайна ідзе папар, поле адразу няглыбока аруць і да звычайнага ворыва ўвосень яшчэ некалькі раз барануюць, каб ачысьціць поле ад травы. Калі ёсьць гной, дык яго возяць і заворваюць ўвосень.

Рана вясной пасьля баранаваньня, а на цяжкіх глiністых глебах і пасьля другога ворыва, высяваецца аўсяна-выкавая мяшанка.

Але, звычайна, гаспадаркі ўвосень гною ня маюць і тады выработак поля пад мяшанку робіцца гэтак. Увосень поле арэцца, узімку вывозіцца гной, рана вясною яго раськідваюць і заворваюць.

Засеў робіцца мажліва раней, каб і корм мець, як найраней. Для мяшанкі бярэцца 8 пуд. выкі і 4 пуды аўсу на 1 дзесяц.

Пры ручным засеву выка і авёс высяваюцца асобна, бо калі іх зьмяшаць, то засеў будзе няроўны.

Падкашваючы ў меру патрэбы мяшанку, гаспадар забесьпячае жывёлу добрым кормам да паловы ліпеня. К гэтаму часу жывёла ўжо ідзе на сьвежую пашу па сенажаці і йржышчу.

А палове ліпеня застаўшаяся частка мяшанкі здымаецца і поле арэцца пад засеў жыта. У некаторых выпадках аўсяна-выкавай мяшанкаю можна карыстацца і пазьней, але трэба памятаць, што поле арэцца не пазьней, як за 2—3 тыдні да засеву жыта.

Для таго, каб забясьпечыць гаспадарку зялёным кормам і на восень, можна зараз-жа пасьля жніва жыта засяваць яшчэ аўсянавыкавую мяшанку. Праз $1^1/_2$ месяцы яе можна ўжо падкашваць і карміць жывёлу.

Таксама можна вясной у зімовае жыта падсяваць сэрадэлю. Пасьля ўборкі збожжа яна дасьць зялёны корм праз $1—1^1/_2$ месяцы. Высяваюць сэрадэлю рана, у часе баранаваньня зімовага збожжа. Насеньня патрэбна каля 2 п. на 1 дзес.

Дзеля таго-ж, каб мець зялёны корм яшчэ раней, раяць з восені ў папары сеяць мяшанку зімовага жыта з зімовай выкаю. Зімовая выка вырастае хутчэй яравой і ўжо к часу, калі жыта пачынае выплываць, такая мяшанка дае добры корм.

Селянін *С. Сялюкін.*

Лён-даўгунец.

У нас на Беларусі вельмі мала ўвагі зьвяртаюць на лён-даўгунец, а між тым ён мае вялікае значэньне для нашых гаспадарак.

У паўночна-заходняй частцы Беларусі і бліжэйшых да яе суседніх раёнах лён-даўгунец зьяўляецца вельмі каштоўнай культурай. Попыт на семя і валакно зараз вялікі і цана на іх стаіць даволі высокая, ня гледзячы на тое, што наша семя і валакно на замежных рынках расцэньваюцца танна, бо якасьць іх ня вельмі высокая.

Валакно лічыцца добрым тады, калі яно аднастайнае, г. зн. аднолькавае даўжыні, афарбоўкі і бляску. Толькі добрым насеньнем можна дабіцца атрыманьня такога валакна. Самае галоўнае, што каштоўна ў валакне, гэта—найбольшая даўжыня і найменшая гальлістасьць сьцябла. Лён-даўгунец дае такое валакно. Лён-даўгунец можна вывесьці пасевам адборнага насеньня. Патрэбна толькі адбіраць насеньне самага буйнога і самага доўгага лёну.

З аднаго лёну добрае семя і добрае валакно адначасна атрымаць ня можна. Пры пасеве лёну на насеньне валакно ня выйдзе добрым, бо выбіраецца насенны лён пасьля поўнага пасьпяваньня, калі сьцябло падсохне і пагрубее, а лепшае валакно дае крышку зеленаваты лён. Дачакаўшы поўнага высьпяваньня лёну ў полі, трэба яго выбіраць, пры чым тут-жа адбіраць самыя высокія сьцяблінь і вязаць іх асобна ў снапы. Пасьля, даўшы гэтым снапом добра выстаяць,—абмалаціць, правеяць і прачысьціць на спэцыяльнай трашчотцы. Яна добра аддзяляе семя ад сарнякоў.

Сеюць лён-даўгунец, як і просты наш лён, пасьля траў, пры шматпольных севазваротах у такім парадку: 1) папар, 2) азіміна, 3) травы, 4) травы, 5) травы і 6) лён. Або пасьля азіміны сеюць ярыну, у якую падсяваюцца травы, а затым лён.

Вучастак пад лён павінен быць ачышчаны ад сарнякоў і галоўным чынам ад павітухі (павіліка, Cuscuta L.), бо яна вельмі шкодзіць лёну.

Посьпех арганізацыі ільнянай насеннай гаспадаркі цэлых вёсак залежыць ад аб'яднананьня і ўзгодненасьці сялян паміж сабою і ад дапамогі, якую ім можа даць дзяржава выдачай выпрабаванага семя, найбольш дастасаванага да ўмоў данай мясцовасьці.

Паасобным гаспадаркам лягчэй вывесьці добрае насеньне шляхам засеву некалькіх сартоў семяні і выбару з іх таго, якое дасьць найлепшыя вынікі.

Агр. Р. Стэльмахаў.

Штучныя гнаі.

(З часопісі „Сільскій Сьвіт")
(пераклаў з украінскага Т. Куніцкі).

Кожны пасеў забірае з раллі пэўную колькасьць складовых часьцін, якія служылі-б расьлінам, як пажыва. З гэтых часьцін найбольш азоту, фосфаравага квасу і паташу—спажываюць расьліны, і іх

заўсёды бракуе ў грунтах. Большую частку пажыўных часьцін зварачываем назад зямлі з хлеўным гноем; вельмі шмат вывозім іх за межы сваей гаспадаркі. Калі прадаем прадукты нашай гаспадаркі, як мяса, малако, то ў першай чарзе прападаюць для нашай ральлі азот і фосфаравы квас; паташ, які галоўна знаходзіцца ў бадылінах расьлін, у сене, саломе, бульбе, або ў буракох, моркве, бручцы, пераважна вяртаецца з гноем на ральлю. Звычайна ўжо ў 2—3-ім годзе працы на ральлі бракуе ёй складовых часьцін гною на пажыву расьлінам і дзеля таго мусім ужываць для яе штучныя гнаі. Штучныя гнаі маюць звычайна толькі адну найважнейшую часьціну для пажывы расьліны ці то азот, ці фосфаравы квас, паташ, або вапна. Яны ўплываюць карысна толькі тады, калі бракуе гэтай часьціны і калі расьлінам яна патрэбна.

На ўсіх землях найвыразьней выступаець брак азоту. Крыніцы, з якіх расьліны бяруць азот, вельмі скупыя, так што звычайна больш расходуецца азоту, чым яго прыбывае. Ральля атрымоўвае азот з хлеўнага гною і забірае яго з паветра пры помачы бактэрыяў, якія жывуць на карэньнях матыльковых расьлін. Азот у ральлі выступае пераважна ў арганічнай форме, гэтак у перагноях і таму чарназёмы і тарфовішчы давозу азоту найчасьцей не патрабуюць. Звычайна й фосфаравага квасу расьліна спажывае больш, чым яго вытвараецца ў ральлі. У ральлі яго ня вельмі многа, а пры гэтым яшчэ выступае ў форме трудна распушчанай. З хлеўным гноем толькі малая частка фосфару зварачваецца ральлі, бо ён галоўным чынам знаходзіцца ў зярнятах, мясе, малаце, а гэтыя прадукты пераважна ідуць у горад на прадажу.

Паташ у большасьці вяртаецца на ральлю з саломай, сенам, бульбай, буракамі, бручкай, а ў прамысловых гаспадарках з брагай, бурачанай жмыхай—пэўная рэч, прайшоўшыя і ператраўленыя праз кармовы праход скаціны. Давоз паташу ёсьць патрэбным на пескаватых і тарфяністых землях, якія ў прыродзе вельмі бедныя паташом.

Усе штучныя гнаі могуць карысна ўплываць толькі тады, калі ральля маець у сабе патрэбную колькасьць вапны. Вапна лёгка распускаецца ў вадзе і дажджавыя воды выпаласківаюць значную колькасьць вапны. Дзеля таго мусім ральлю час ад часу ўгнойваць вапнай, ня толькі каб прыдбаць пажывы расьлінам, але перадусім, каб дадаць вельмі важнай пажыўнай часткі, якая маець вялізарны ўплыў як на фізычныя, так і хімічныя свойствы—зямлі.

Ураджай з поля залежыць не ад пераважаючай колькасьці якога колечы гною, але ад таго гною, якога ў ральлі найменш. Каб ня выкідаць грошы ў форме дарагіх штучных гнаёў наасьлеп у ральлю, трэба пераканацца, якіх спажыўных частак ральля мае найменш. Гэтага дасягнем, калі будзем закладаць дасьледныя палі, якія, абсеяныя рознымі штучнымі гнаямі, або рознымі іх павязаньнямі пакажуць запраўднасьць росту пасеяннай расьліны.

Штучныя гнаі ўплываюць найменш на землях з пэўнай колькасьцяй перагною, з добрымі фізычнымі здольнасьцямі і пры спрыяючых кліматычных абставінах. Зьдзічэўшыя і мокрыя землі на штучныя гнаі рэагуюць кепска.

Што праўда, штучныя гнаі збагачаюць ральлю ў паасобныя пажыўныя часьціны і павялічваюць збор з поля, але яны не дадаюць ральлі перагною і тым самым, за выняткам вапны, не папраўляюць

фізычнай здольнасьці ральлі. Дзеля таго даўжэйшае ўжываньне штучных гнаёў, без дадатку хляўнога гною, або зялёных гнаёў, ня ўдасца карысна правясьці.

АЗОТНЫЯ ГНАІ.

Чылійская сялітра. На заходнім узбярэжжы Паўдзённай Амэрыкі, амаль пазбаўленай дажджоў, знаходзяцца паклады слаўнай Чылійскай сялітры. Гэта — павязаньне азотнага квасу з содам ($N_6 N O_3$), якога адзін цэнтнар (100 кгр.) мае 95—97 проц., а чыстага азоту $15^1/_2$ — 16 проц. Гэта ёсьць белая соль, якая лёгка распускаецца ў вадзе і вельмі лапчыва прыцягвае вільгаць з паветра, або каратка кажучы, вельмі гіграскапічная. Дзеля таго сялітру трудна пераховываць, бо, вільгатнеючы, зьбіваецца ў груды, якія перад высеўкай абавязкова трэба патаўчы. Сялітра гэта павязаньне, якое расьліны найлягчэй спажываюць, і таму сялітра ўплывае на расьліну шмат хутчэй, чым іншыя азотныя гнаі.

Дзеля таго, што зямля не затрымовывае сялітры, яна можа, як водны рашчын, свабодна разьмяшчацца ў зямлі. З гэтай прычыны сялітру ўжываем, як галоўнае ўгнаеньне, больш даем яе ўжо ў часе росту расьліны.

Праз тое, што зямля не затрымоўвае сялітры, як ўжо было сказана, дажджы выпаласківаюць яе ў глыбейшыя слаі зямлі раней, чым карэнчыкі маглі-б ей пакарыстацца і яна бескарысна прападае для расьліны. Дзеля таго не належыць спадзявацца на даўжэйшы ўплыў сялітры. Галоўна таму на лёгкіх землях ужываецца яна ў малых колькасьцях, затое некалькі разоў у працягу вясны. Сялітра можа распусьціць у зямлі тыя гнаі, якія затрымала зямля, як фосфаравы квас і паташ, і гэткім чынам змушае расьліну выкарыстаць і гэтыя часьціны. Але трэба так-жа заглядацца і на другі бок справы, памятаючы, што аднабокае моцнае ўгнаеньне ральлі сялітрай прыводзіць да зьбяссіленьня і аслабленьня расьліны.

Калі хочым уратаваць слабейшыя засевы, дык сялітра тут робіць цуды. Расьліны зараз пасьля яе рассеяньня набіраюць цёмназялёнага колеру і пачынаюць буйнець. Сялітра падносіць працэнтнасьць бялка ў зярнятах.

Таму, што сялітра вельмі хутка і моцна ўплывае на расьліны, ужываецца яна пераважна вясной. Раньні ўжытак сялітры пабуджае расьліны да буйнасьці і тым самым прадаўжае час іх росту. Калі-ж ужыць сялітру запозна, або ў надмернай колькасьці, дык расьліны выпускаюць новыя расткі, а праз гэта позна й няроўна дасьпяваюць. Пара, у якой ужываецца сялітра, вельмі розныя. На азіміну рассеяць сялітру трэба проста на рунь, лепш найранейшай вясной, як толькі азіміна пачне расьці. Калі заходзіць патрэба сялітраваньня, можна паўтарыць, але асьцерагацца, каб не спазьніцца. Рабіць гэта можна пакуль збожына не перастала буйнець. З ярынаў—авёс і яравая пшаніца могуць спажываць найбольш сялітры. Ячмень сялітру ня вельмі добра зносіць, дык належыць падсяваць яе да часу, пакуль расьліна гэта не атрымаець 3-х лісткоў. Таксама пад бульбу трэба даваць сялітру зараньня, каб не апазьніць завязываньне бульбінаў.

Найлепш выкарыстоўваюць сялітру буракі, але трэба ўмела яе ўжываць. Найлепш падзяліць цэлую колькасьць сялітры, прызначанай

пад буракі, на 2—3 часткі і першую даць адразу, як узойдуць расьліны, а апошнюю ў чэрвені перад астатняй апалоўкай буракоў.

Згушчаны рашчын сялітры, калі пападзе на вільготныя ткані расьлін, нішчыць іх зусім. Дзеля гэтага, сялітру рассяваюць толькі пад час сухой пагоды на зусім абсохшыя расьліны. Найлепш рассяваць сялітру зьмешаную з зямлёй. Сялітра — гэта атрута, а таму нельга пасьвіць скаціну на сьвежа сялітраваных пасевах і наагул уважаць, каб сялітра ці мяшкі ад яе ня стыкаліся з пашай. На глінястых землях значнейшая колькасьць сялітры творыць скарупу.

(Далей будзе).

Аграном *А. Берзін.*

Як сеяць лубін на зялёнае ўгнаеньне.

На Беларусі пры малым ліку скаціны бяз лубіна не магчыма мець добрыя ўраджаі. Але сеяць лубін трэба ўмеючы, бо ад гэтага залежыць добры ўраджай зялёнае масы. Заўважым, што **лубін розьніцца ад збожжавах расьлін тым, што карэньні яго йдуць глыбока ў зямлю, а з паветра ён карыстаецца каштоўным азотам.** Вось чаму і на благім полі, дзе збожжа расьці ня можа, лубін без усялякага ўгнаеньня дае добры ўраждай. На **глебах** балотных і вільгатных лубін не ўдаецца. Па досьледам Горацкае с.-г. дасьледчае станцыі на **лёгкіх і шчыльных суглінках зялёная маса лубіну дасягала 3000 пуд. з дзес.**

Найлепшай глебай **дзеля** лубіна лічыцца пухлянае і цёплае пескавое поле, але на зусім пустых пяскох лубін дае добрую **зялёную масу** толькі за другім ці трэцім засевам.

Апрацоўка глебы пад лубін мала чым адрозьніваецца ад іншай ярыны. Асабліва сур'ёзную ўвагу трэба зьвярнуць на чыстату поля, бо шкодныя травы вельмі шкодзяць усходам лубіну да часу зьяўленьня на яго кареньні гузачкоў (клубянькі). Да гэтага часу лубін расьце вельмі марудна. Для барацьбы са шкоднымі расьлінамі поле пад лубін трэба араць з восені.

Угнаеньне глебы пад лубін у нашых умовах робіцца вельмі рэдка. Але да гною (навет у невялікім ліку) па досьледам Новазыбкаўскае дасьледчае станцыі лубін вельмі чулы. Апошняе асабліва каштоўна, калі яго сеюць першы раз на пустых глебах.

Мінэральныя ўгнаеньні (парашкі) **значнага павялічэньня масы лубіну не даюць.** Гэта можна тлумачыць тым, што лубін у ніжэйшых пластох нашых глеб знаходзіць даволі для сябе пажыўных сокаў, якія не выкарыстоўваюцца іншымі расьлінамі.

Пры засевах лубіну трэба зьвярнуць увагу:

1) **на якасьць насеньня,** якое прызначана да засеву;
2) **на прысутнасьць у глебе лубінавых бактэрый** (мікробаў);
3) **на час, у які спаўняецца сеў лубіну;**
4) **на спосаб і глыбіню засеву.**

Прадажны лубін часта мае малую ўсходжасьць, бо буйное насеньне яго, калі яно ня добра высушана, пачынае плясьнець і траціць сваю ўсходжасьць.

Перад засевам лепш заўсёды спрабаваць усходжасьць насеньня. Для чаго з розных месц кучы насеньня бяруць 100 зярнят і кладуць

на талерку паміж двумя кавалкамі мокрага палатна і частавата змочываюць іх вадою.

Калі за 10 дзён прарасьце менш 70 зярнят, то насеньне лічыцца дрэнным і засеў такім насеньнем няпэўны.

Пры сярэдняй усходжасьці (каля 80 проц.) **патрэбна насеньня лубіну на 1 дзес.** 10 — 13 пуд. пры раськідным засеву і 8 — 10 п. пры радковым.

Другое, **дзеля добрага росту лубіну трэба яшчэ, каб у глебе былі лубіновыя бактэрыі**, якія бяруць з паветра азот і ўтвараюць на карэньні лубіну ўсім вядомыя клубянькі.

У полі, на якім лубін раней ня рос, гэтых бактэрый у глебе няма; яны зьяўляцца толькі пад канец росту лубіну і, вядома, дапамогуць яму мала.

Пачынаючы сеяць лубін, варта заўсёды заражаць поле бактэрыямі. Спаўняецца гэта рознымі спосабамі. (Папярэдні і зусім рэдкі засеў лубіну на тым-жа полі ў мінулым годзе; раськіданьне па полі зямлі з-пад ранейшага севу лубіну і інш.).

Усе гэтыя спосабы заражэньня поля бактэрыямі ўжываюцца і пры засеву сэрадэлі.

Заражэньне заўсёды трэба рабіць у хмарную пагоду і па магчымасьці хутчэй, бо сьвятло сонца шкодзіць бактэрыям.

Лубін любіць цяпло і баіцца веснавых прымаразкаў, дзеля чаго найлепшым часам сяўбы лічыцца канец траўня. (**Насенны лубін сеюць раней!**). У сырую і халодную пагоду насеньне лубіну можа ня ўзышоўшы загніць. Прарастае насеньне лубіну пры 4—5° Цэльсія.

Нельга вельмі глыбока прыкрываць насеньне лубіну, бо, прарастаючы, ён павінен выносіць на паверхню зямлі свае (даволі буйныя) два першыя лісткі.

Пры мелкім-жа прыкрываньні (**на пяскох**) насеньне выбіваецца на паверхню дажджом і гіне, а пры сухой пагодзе доўгі час не прарастае.

Лепшай глыбінёй прыкрыцьця лубіну на лёгкім пескавым полі трэба лічыць ³/₄—1 вярш., а на больш шчыльных глебах і менш.

Лепшым спосабам засеву лубіну лічыцца радковы, пры якім усё насеньне можна ўкласьці на аднолькавую і патрэбную глыбіню.

Далей, ад **самага засеву і да заворваньня лубін не патрабуе ніякага догляду**, апрача мо' толькі аднаго поліва, калі ўсходы забіты шкадлівымі травамі.

Пад жыта лубін трэба заворваць за тры-чатыры тыдні да засеву. Трэба каб да засеву жыта зямля асела, а маса лубіну пачала б загніваць. Калі-ж масы было вельмі шмат і яна кепска прыціснута пластамі ральлі, то поле трэба павальцаваць.

Заворваць лубін можна няскошаны. Каромыслам плуга ці ланцугом, прывязаным да дышля плуга, лубін добра кладзецца і прысыпаецца пластамі ворыва.

Здараецца, што лубін ідзе на ўгнаеньне бульбы і інш. ярыны. Тут ужо можна атрымаць больш зялёнае масы. Дзеля гэтага лубін пакідаюць на полі да таго часу, калі пачнуць сохнуць дробныя лісьцікі сьцябла. Гэта паказвае, што лубін больш не расьце і яго можна заворваць. Ад часу красаваньня лубіну і да часу зьяўленьня на ім бліскучых струкоў вага масы лубіна можа павялічыцца ў 2¹/₂—3 разы. (Досьледы Новазыбкаўскае дасьледчае станцыі).

Агроном *Б. Бабіцкі.*

Як павялічыць ураджай бульбы.

Бульба зьяўляецца галоўнай асыпнай культурай Беларусі. Яна займае звыш 10% пасяўной плошчы. У Палесьсі бульба займае звыш 16% пасяўной плошчы. Ураджайнасьць бульбы ў умовах нашай сельскай гаспадаркі вельмі нізкая — у сярэднім па Беларусі 550 пуд. з дзес. Культура бульбы мае вялікае значэньне для сельскай гаспадаркі: яна павялічвае кармовыя запасы, дапамагае пашырэньню гадоўлі сьвіней і г. д. Бульба зьяўляецца рыначнай культурай Беларусі.

Пры нашым малазямельлі і лішках рабочай сілы патрэбна пашырэньне такіх расьлін, на культуру якіх траціцца шмат працы на малой плошчы зямлі. Бульба і зьяўляецца ў умовах Беларусі такой культурай, якая патрабуе найбольшую колькасьць рабочых рук (60—75 рабочых дзён на дзес, авёс-жа і ячмень толькі 14—15 дзён).

Для гаспадароў цікава ўжываць такія тэхнічныя спосабы, якія маглі-б павысіць ураджайнасьць бульбы.

Па досьледам Турскай с.-г. дасьледчай станцыі (Бабруйская акруга) ўраджай бульбы заўседы павялічаецца ад ворыва на зябь. Ураджай бульбы пасьля такой воркі на няўгноеным полі больш на 240 пуд., на ўгноеным-жа—на 378 пуд., або на 40%. Дзякуючы ворцы на зябь, з восені ржэўнік добра перапраўвае. Ад гэтага ў зямлі бывае шмат перагною і пажыўных матэрый, якія карысны для яравых засеваў і асабліва для бульбы. Пры асеньняй ворцы насеньне дзікіх траў прарастае, а калі наступяць замаразкі, яны гінуць. Такім чынам, усе пажыўныя матэрыі, не скарыстаныя дзікай травой, застаюцца ў зямлі. А вясной яны будуць скарыстаны бульбай, якая дасьць павышаны ўраджай на 30—40%.

Ворку на зябь трэба рабіць раней. Глыбіня яе павінна быць 4 вяршка. Уплыў гэтай воркі на ўгноеным полі лепшы, чым на спустошаным, бо яна дапамагае лепш раскладацца гною. Ворка на зябь дае ўраджай бульбы на ўгноеным полі на 378 пуд. больш, чым на няўгноеным. Асеньняя ворка на зябь дапамагае вясеньняй і такім чынам бульбу можна пасеяць у час. Ворка на зябь у сярэднім павышае ўраджай бульбы на 300 пуд., што пры нашай цане (2 зл. за пуд.) дае 600 зл. Сама праца ў асеньнюю пару можа быць ацэнена ў 16 зл.

С. Журык.

Як гадаваць цялят вясной і летам.

У гаспадарках нашых сялян цяляты родзяцца галоўным чынам ад студзеня да красавіка. Калі здараецца, што каровы целяцца позна вясною ці летам, то такіх цялят не гадуюць. Гэта робіцца затым, што ў рабочую пару малако патрэбна і дзеля сям'і гаспадара. З гэтай прычыны мы разгледзім гадоўлю цялят толькі тых, якія вясною маюць каля 3-х месяцаў.

Да 3-х месяцаў цялят трэба карміць перш малаком, а далей пойлам, сенам, мукой і цэлым зярном аўса. Пасьля 3-х месяцаў цялятам можна даваць сьвежа-скошаную траву ці пускаць іх на пашу.

У 3 месяцы сялянскія цялята важаць каля $3^1/_2$-4 пуд. Пры такой

вазе ім трэба па норме 7 фунт. кармовых адзінак (ці проста 7 фун. сярэдняга аўса). Гэтыя 7 кармовых адзінак цяляты могуць атрымаць у розных кармох. Вясной, калі цяляты пасуцца на добрай траве, то яны зьядаюць каля 18 фун. травы, што замяняе 5 фун. кармовых адзінак, а недахватку 4 фун. кармовых адзінак абавязкова патрэбна дадаць аўсом. Авёс лепш усяго даваць цялятам 3 разы ў дзень (раніцай, днём і ўвечары). Без аўса цяляты хаця й растуць, але вельмі дрэнна. Ад такіх цялят нельга чакаць добрай каровы, бо яны самі заморкі. Хаця авёс і патрэбен у гаспадарцы, але калі памятаць, што з цяляці вырасьце дойная карова на некалькі год, то аўса шкадаваць ня трэба. Калі цялят падкармліваць аўсом, то з іх будуць буйнейшыя каровы і такім чынам далей можна павялічаць жывую вагу сялянскіх кароў. Паіць цялят трэба 3 разы ў дзень чыстай вадой.

Пераход ад хлеўнога ўтрыманьня цялят да веснавога ці летняга павінен быць паступовы. Першыя дні цялята кормяцца ў хлеве сухімі кармамі і выганяюцца на 1-2 гадзіны ў дзень; на 4 дзень на 3 гадзіны, на 7 дзень на 6 гадзін, далей і на цэлы дзень.

Вясной лепш усяго пасьвіць цялят у загарадцы. Для гэтага кавалак добрай пашы абносяць плотам і цялята там ходзяць увесь час. Летам цялят ня можна трымаць у хлеве, а таксама і пасьвіць іх на прывязі. Цяляты, як маладая жывёліна, павінны гуляць на прасторы, бо для іх вельмі патрэбна сьвежае паветра.

Калі пашы добрай няма, то цялят падкармліваюць кошанай травой. Падкормку гэту трэба рабіць абавязкова ў загарадцы, а ня ў хлеве. У хлеў-жа летам скаціну можна заганяць толькі на ноч.

Вясной у падкормку цялятам можна даваць траву, сабраную з меж; далей у палове ці канцы траўня падрастае канюшына і выкавая мяшанка. Гэты корм вельмі добры, але яго трэба даваць толькі сьвежым.

Ніколі ня трэба пускаць цялят у стада з авечкамі ці старою скацінай. Калі цяляты ходзяць з авечкамі, то яны будуць заўсёды галодныя, бо авечкі вельмі нізка зьядаюць траву і цялятам нічога не застаецца на пашы. Разам з каровамі цяляты таксама не пад'ядаюць. Пры такой пашы яны растуць вельмі дрэнна і бываюць маленькія. Праўда, на хутарох, дзе паша добрая і скаціны пасецца мала, цялят можна пасьвіць і разам з каровамі. Авёс-жа ў ліку 3-4 фунтаў на галаву цялятам трэба даваць усё лета.

Калі так гадаваць цялят, то з іх вырастуць добрыя каровы.

Агроном *Цімашкоў*.

Правілы даеньня кароў.

Умелае кармленьне і даеньне кароў мае аднолькавае значэньне ў падтрыманьні малочнасьці. Няўмелым даеньнем можна хутка сапсаваць карову. І вось чаму кожны гаспадар павінен ведаць наступныя правілы даеньня.

1) Даіць карову трэба з правага боку адначасова за дзьве сыскі (заднюю правую з пярэдняй левай і наадворот).

2) Нельга даіць двумя пальцамі, калі адцягваньне вымя робіць жывёле боль і непакой. Лепшым будзе даеньне далоньню. Робіцца яно так: сыска, як можна вышэй, бярэцца вялікім і паказальным

пальцамі, затым паступова сьціскаецца наступнымі пальцамі; малако пераходзіць з верхняй часьці сыскі і выцякае ў падойнік.

3) Першыя дзьве-тры струйкі трэба выдаіць на зямлю. Гэта прамывае канцы сысак ад папаўшай туды гразі і пылу, якія служаць прычынай порчы малака.

4) Даіць трэба без перапынку, роўнамерна, але хутка. Вялікая пена ў дайніцы ёсьць добрая прымета ўмелай дойшчыцы.

5) У часе даеньня, як і заўсёды, ня раіцца біць і крычаць на карову. Гэта прымушае карову неахвотна аддаваць малако, а то і затрымоўваць яго. З жывёлай трэба быць ласкавым.

6) Пільная ўвага патрэбна ў канцы даеньня. Ня раіцца пакідаць карову ня выдаенай. Гэта можа сапсаваць самую малочную карову. Яна паступова прывыкне пакідаць частку малака.

Для найлепшага выдойваньня раіцца злёгку пацерці вымя з усіх бакоў.

7) Пасьля даеньня трэба выцерці сыскі, змазаць іх вазэлінам, або нясоленым кароўім маслам.

8) Нельга абмачваць сыскі першымі струйкамі малака, што так часта любяць рабіць дойшчыцы.

9) Перад самым даеньнем ня трэба раздаваць корм, бо гэта ўздымае шмат пылу, ад чаго ў малако пападае пыл і розныя мікробы.

Энтомолог Бранцау.

Зьнішчайце гародную блыху.

Гародныя блохі, або блашакі зьяўляюцца шкоднікамі нашых гародаў. З году ў год яны нападаюць на капусту, бручку, буракі, турнэпс, рэдзьку, рэпу, радыску. Кожны год гароднік думае, як яму адратаваць свой гарод ад гэтых шкоднікаў.

Каб барацьба з гароднай блыхою была пасьпешнай, трэба ведаць яе жыцьцё.

Капусныя блохі — гэта невялічкія жучкі (яны здатны скакаць). Яны асабліва рухавы і шкодны ў ясны сонечны дзень. Ёсьць блошкі чорныя блішчастыя; у іншых на сьпіне (па надкрыльлях) жоўтыя зьвілістыя пасачкі.

Перазімаваўшы пад грудкай зямлі, або сярод лісьця ці ў шчылінах гародніх будынкаў, блошкі прачынаюцца раньняй вясною. Перш яны ядуць дзікія расьліны (сьвірэпку, торбачнік палявы і інш.), а як толькі ў грунт пасаджана расада або ўзыходзяць засевы гародных расьлін, яны адразу накідваюцца на іх і ядуць лісьця. Ад гэтага на лістох зьяўляюцца дзірачкі (гл. мал.); лісьця пачынаюць жаўцець і сохнуць. Гароднікі іншы год па два ці тры разы садзяць расаду ці робяць новыя засевы, каб толькі атрымаць ураджай.

У канцы траўня, у пачатку чэрвеня жучкі пачынаюць класьці на лістох сарнякоў і гародніх расьлін яечкі.

З яечак выходзяць чарвячкі, якія ўядаюцца ў мякаць ліста і жывуць там, робячы ўім ходы. Чарвячкі некаторых блошах жывуць на карэньнях расьлін (турнэпс). Як толькі чарвячок вырасьце, ён выходзіць з ліста ці кораня і закопваецца ў зямлю, дзе ўжо ператвараецца ў дарослага жучка і дзе чакае новае вясны.

Гэткім чынам, жук-блошка, як і шмат іншых кузурак, перажывае

4 выразных зьмены: *яечка*, *чарвячка*, *мяшэчка* (*кукончыка*) і *дарослага жука*.

Дарослы жук найбольш шкодзіць вясною, чаму ўсю ўвагу дзеля барацьбы з ім трэба зьвярнуць у гэты час. Як-жа змагацца з блошкаю?

1) Зьнішчайце сарнякі (торбачнік палявы, сьвірэпку, дзікую рэдзьку і інш.). Яны даюць прытулак перазімаваўшым блошкам; імі-ж блошкі і кормяцца ў працагу 1-1½ м-цаў, пакуль высадзяць расаду ці зьявяцца ўсходы гародніх расьлін.

2) Захоўвайце расаду ад блыхі, робячы расаднікі над зямлёю. (Расаднікі гэтыя робяць на слупох у 1½-2 арш. вышынёю *).

3) Адцягвайце засеў і высадку расады, як найдалей, бо блошак найбольш у красавіку і траўні. Рэпу-ж добра бывае садзіць у сярэдзіне чэрвеня.

4) Расаду капусты на грады трэба садзіць здаровую і па магчымасьці ў сырую пагоду.

5) Расьліны, на якія ўжо напала блыха, апрысквайце вадою.

6) Выбірайце расьліны тых сартоў, якія менш або зусім не баяцца блыхі. Капуста Браунгшвэйгская, Дзітмарская, Сабураўка; або: Зэніт, Штэйнкорф; з турнэпсу-Банкгольм і Масляны жоўты васкавы; з рэпы— Пятроўская, Фінляндзкая жоўтая, Круглая чорная, з бручкі — Швэдзкая, Вільгельм, Краснасельская.

М. Бурштэйн.

Рыхтуйцеся да закладкі садоу.

У найбліжэйшыя 2-3 гады нашы пладовыя школкі пачнуць пашыраць прышчэпы яблынь, ігруш і г. д., здавальняючы патрэбы сялянства.

Падрыхтоўка плошчы пад сад павінна пачацца за год, а лепей за 2 гады раней.

Вада грунтовая павінна быць ня бліжэй ад 2 мэтраў (3 аршыны), а яшчэ выгадней да 3-4 мэтраў (4½-6 аршын) ад паверхні зямлі.

Маючы мэту праз год, а можа праз два высаджваць прышчэпы, плошчу займаюць бульбай, буракамі, пад што кладзецца ўвосень гной да 2000-3000 пуд. на 1 гэктар (блізка 1 дзесяціны). Калі гною няхват, трэба высяваць лубін з парашкамі і заворываць. Гэткім чынам зямля вырабіцца і будзе мець сілу добра гадаваць высаджаныя прышчэпы. Ніколі не садзіце сад на іржышчы.

Дрэвы ў школках вельмі добра даглядаюцца, чаму па высадзе ўжо ў сад яшчэ лепш павінны даглядацца.

Яблыні трывалых сартоў на нашых лясных дзічках дажываюць да 70-80 год, а грушы больш 100.

Пры выгодных умовах асобныя гатункі яблынь, як, напрыклад, антонаўка, ружовае і інш. у 30-35 год пашыраюць свае кароны да 10 мэтраў (15 арш.).

Згодна прапановы Горацкай дасьледчай станцыі новыя сялянскія сады закладаюцца ў нашай ваколіцы (каля Горак) на 10 мэтраў (рад ад раду).

Вельмі цікавае зьявішча ў гэтым напрамку мы бачым пасьля вайны ў Нямеччыне. Яблыновыя сады садзяцца на 15-20 мэтраў дрэва ад дрэва; гэта знача на 20-30 аршын. Заўсёды паміж дрэвамі будзе маг-

*) Гэты спосаб можна ўжываць як сеюць разсады надта мала (*пр. Рэд.*).

чымасьць карыстацца плошчай і займаць яе гароднінай, ягаднікамі і г. д. Апрача таго, на выпадак вайны і галадух маняцца садзіць у садох бульбу, сеяць пшаніцу.

Што тычыцца часу высадкі дрэў, то трэба дбаць аб тым, каб прышчэпы высаджваць раней восеньню, навет калі яшчэ трымаецца трохі пабурэўшы ліст. Ліст абрэзваюць.

Пасьля пасадкі блізка каля штамба накідваецца курганчыкам зямля ў 35 сантымэтраў (6-8 вяршкоў), маючы мэту бараніць карэньні ад холаду; вясной курганчык разгорваецца.

На цяжкіх глебах дрэвы выгадней будзе садзіць веснавою парой.

Абрэзка кароны першай вясной з найбольшым пасьпехам магчыма тады, калі прышчэпы будуць высаджаны ўвосень.

Прышчэпы трэба высаджваць квадратам.

Спачатку трэба паставіць аструганы кол у 12 сант. (3 вяршкі) таўшчыні і ўбіць яго ў зямлю. Прымаючы пад увагу, што ў час пасадкі зямля павінна быць добра выраблена (пасьля бульбы), астаецца толькі выкапаць невялікую ямку дзеля таго, каб зьмясьціць толькі карэньні прышчэпкі. Капаць глыбокія ямы ў нашых выпадках мы лічым не патрэбным і навет шкодным. Дрэва трэба зьмясьціць з поўначы, каб з поўдня кол затрымліваў прыпёк сонца.

Першыя 5 8 гадоў даглядаюць, каб штамб быў добра прыцягнуты да кала. Блізка карэньняў падкідваюць кампост, або гной (штогод) і з вясны перакапываюць.

У першыя гады паміж дрэвамі часта кладуць гной і садзяць бульбу, буракі, капусту, гарох і іншыя бабовыя расьліны (апрача канюшыны); карысна заворываць лубін. Ніколі ня сейце жыта, пшаніцу, авёс у садзе.

У працягу 3-4 гадоў пры гэткім доглядзе сад вельмі шпарка пойдзе ўрост.

Шмат садоў, заложаных у 1922 і 1923 г.г. у ваколіцы Горак пад нашым доглядам, сьведчаць аб значным дасягненьні ў гэтым напрамку. Здаецца, што па буйным узросту дрэвы высаджаны нібы 5-6 год.

Мінулы год маладыя сады густа зацьвілі, але *плодазавязь* сарвалі, чаму ўзрост штамба яшчэ павялічыўся.

З. В.

Лекарскія зёлкі.

Найлепшай парою да зьбіраньня лекарскіх зёлак з'яўляецца сонечні поўдзень, калі раса абсохне. Зельле, сабранае з расою, або мокрае ад дажджу, чарнее і лёгка загнівае, а тады ўжо яно ні на што ня здатнае і ніхто яго ня купіць.

Рэдка бывае памоцным усё зёлка ад караня да кветкі; найчасьцей з аднаго зёлка зьбіраем толькі кветкі, з другога лісьця, з трэцяга кару, ягады, карэньні. Кожную частку зельля стараемся сабраць у тую пару, калі яно мае ў сабе найбольшы запас лекарскіх субстанцый. Кветкі звычайна зьбіраюцца падчас поўнага іх красаваньня; овацы і насеньня павінны быць зусім сьпелымі; лісьця перад красаваньнем; цэлыя зёлкі падчас красаваньня; карэньні ўвосені або рана вясною; кара вясною, перад тым як зварушацца сокі дрэва.

Зьбіраюцца зёлкі толькі здаровыя, моцныя; хворыя, папсаваныя,

слабыя, заражаныя іржою і надта брудныя—старанна абмінаем.—Мыць зёлак нельга; нат карэньні трэба мыць вельмі хутка, каб не нацягалі вады і пасьля, праз пару гадзін пратрымаць іх у падвышанай тэмпэратуры, каб хутчэй абсохлі.

Сушыць зёлкі можна: на вольным паветры (карэньні), у сухім і цёплым месцы (лісьця), у цяньку (кветкі) і ў сушарні, або ў печках пасьля хлеба (карэньні і некатарыя ягады). — Кветкі, лісьця і цэлыя зёлкі трэба сушыць зараз-жа пасьля збору. — Расьцілаюць іх на чыстых дошках, палатне, або паперы памагчымасьці самым тонкім пластам, каб ня парыліся і хутка высыхалі. На адзін квадратны мэтр расьцілаецца цэлага зельля або лісьцяў 1-м кіляграм, а кветак ½ кіляграма.

Карэньні, апрача некатарых, крышацца ў кружкі, або квадраты вялічыні 1-го сантымэтра. Кара, зьдзёртая з галін, крышыцца ўпоперак. Ягады: маліны, рабіны, суніцы (чырвоныя ягады) трэба сушыць на сонцы, тады яны затрымаюць свой колер, без каторага ў прадажы ня маюць вартасьці.—Чорныя ягады і др. можна сушыць у печках пасьля хлеба, пільнуючы, каб не прыгарэлі.

Акуратна высушаныя зёлкі, гэта ўжэ „тавар", які вымагае адпаведнай упакоўкі. Некатарыя пакуюцца ў мяшкі, другія ў скрынкі; як у першых так і ў другіх павінны быць моцна ўціснутыя. Трымаць трэба такі тавар абавязкава ў самым сухім месцы, а найлепш пасьля заканчэньня збору даннага зёлка зараз-жа яго адсылаць купцу, з якім зробленая ўмова.

Ніжэй буду падаваць апісаньня лекарскіх зёлак у тым парадку, як іх, пачынаючы з вясны, можна зьбіраць, бяручы пад увагу выключна тыя, якія маюць гандлёвае значэньне.

У траўні з найбольш платных зьбіраем:

Карэньні:

Дзеравянкі (Potentilla tormentilla). **Панчошніка**, інакш Сабачае мыла (Saponaria officinalis). **Буквіцы**, інакш касьцян, купальнік (Arnica montana).

Лісьця.

Мучальніка (Arctostaphylos Uva Ursi). **Сончыкаў** (Anemone Pulsatilla).

Кветкі.

Канвалеі—(Convallaria majalis). **Зязюльчыных панчошкаў** (Грабелькі, Ключыкі сьв. Пятра і Паўла). (Primula officinalis), **Падбелу**—Tusilago farfara).

Ягады.

Ялаўца. Juniperus communis).

К а р а.

Крушыны (Rhamnus frangula).

1) **Дзеравянка**. Расьлінка трывалая; расьце ў цяністых мясцох, зарасьлях, на пасеках. Быльнік тоненькі, сьцелецца па зямлі; лісьця бліскучыя, прыземныя, трыдзельныя, цыбніковыя пяцідзельныя. Кветкі маленькія, жоўтыя чатырохпялёстныя. Корань грубіні пальца, зьверху чорнабуры, у сярэдзіне чырвонабуры, зьбіраецца ўвосені, або вясною,

пакуль цыбнік расьці не пачынае. — Акуратна памыты крышыцца ў дробныя, роўныя кусочкі і сушыцца ў цяньку.

2) **Панчошнік**. Расьце каля хатаў, пад плотамі і на межах. Дарастае 30-60 цм. вышыні. Цьвіце ад чэрвеня да жніўня белым, або бледна-ружовым цьветам, зложаным у зорку з 5-ці адваротна яйцаватых пялёсткаў.—Карэньні старэйшых расьлін капаюць увосені, або вясною, мыюць, дробна крышаць і сушаць у цяньку. — Сухі корань звараны ў вадзе дае пену, як мыла, у якой вельмі добра мыецца ўсялякая чорная вопратка.

3) **Буквіца**. Невялікая расьлінка, мае быльнік і яйцаватыя лісьця, густа пакрытыя валаскамі, кветачныя галоўкі даволі вялікія, залацістa-жоўтыя. Уся расьліна мае прыемны пах, смак яе горкі; расьце на макраватых месцах, у зарасьлях.—Лякарскае значэньне маюць кветкі і карэньні.—Кветкі зьбіраюць, як толькі яны распускаюцца — (перацьвіўшыя няздатныя) праз чэрвень і ліпень.—У кветках буквіцы знаходзіцца шмат усялякіх казюляк; каб іх пазбыцца, дасушваюць кветкі над гарачым вугальлем. — Каб атрымаць лепшы тавар, трэба кветкі адшчыпаць і высушыць бяз кветчанага дня. — Аднак, большае значэньне, чым кветкі, мае корань буквіцы і даражэйшы ён у пяць разоў.—Рана вясною капаюць яго, чысьцяць, крышаць дробна і сушаць у печках, або сушарнях. — Як кветкі, так і карэньні ўпаксўваюцца ў шчыльныя скрынкі, каб ня страцілі паху.

Мучальнік (Мачанічнік). Невялікі ўсезялёны кусьцік з сьцелючымся цыбнікам, вельмі падобны да брушніцы. Ягады таксама вельмі падобны з вонкавага выгляду, бо ў сярэдзіне гучністыя і з цьвёрдымі зярнятамі. Расьце цэлымі пластамі найбольш у сасновых лясох, па ўзгорках. Цьвіце ў траўні і чэрвені. Лісьця мучальніка можна зьбіраць праз усё лета; сушыць у цяньку і сухое перасеяць праз драцяное сіта. Трэба зьвяртаць вялікую ўвагу, каб не зьмяшаць лісьцяў чарніцы, або брушніцы, бо тады тавар ня будзе мець ніякай вартасьці.

Сончыкі. Лісьця маюць шэра-зялёныя, трайчаста пярыстыя. Званкаватыя, вялікія, цёмна-фіялетавыя кветкі сядзяць па аднэй на высокіх шэра-кашлатых цыбніках. Цьвіце ў сакавіку і красавіку. Расьце на сухіх пяшчаных узгорках. Зельле зьбіраюць падчас красаваньня і сушаць у цяньку; мае яно смак гостры пякуча-горкі і зьяўляецца даволі сільнай **атрутай**.

Канвалея. Мае два шырока-лянцэтаватыя лісьця, з паміж каторых выходзіць невялічкі цыбнік, на якім зьвешываюцца на адзін бок чыста-беленькія вельмі пахнючыя кветкі, кругла-званкаватай формы. Цьвіце ў траўні і на пачатку чэрвеня. Расьце ў цяністых лясох. Зьбіраюцца кветкі бяз кветачнай ножкі і сушацца ў цяньку. Павінны захаваць свой прыродны белы колер. Асобна зьбіраюцца лісьця бяз цыбалак. Уся расьліна—**атрута**.

Зязюльчыныя панчошкі. Лісьця маюць яйцаватыя, зморшчаныя, кругла-зубкаваныя. Кветкі сьветла-жоўтыя, рулькаватыя, сабраныя круглымі кутасамі на вярхох 15—30 цм-вых цыбнікоў. Цьвіце ў красавіку і траўні. Расьце на мурагох, у садох, па берагох лясоў. Зьбіраюцць кветачныя кароны і сушаць ў цяньку. Сухія кветкі моцна ўціскаюцца ў шчыльныя скрынкі. Сухія кветкі моцна пахнуць мёдам.

Падбел. Мае корань глыбака сядзячы ў зямлі, які ў сакавіку і красавіку выпускае некалькі нявысокіх бела-кашлатых цыбалак, на каторых сядзяць па аднэй жоўтыя зложаныя кветкі. Як яны ўжо ад-

цьвітуць, тады выходзяць з зямлі прыземныя круглавата-сэрцаватыя лісьця, зьверху гладкія, бліскучыя, падысподам бела-кашлатыя. Расьце падбел на сонечных мейсцах, на вільготным, глiністым груньце. Для лекарскага ўжытку зьбіраюць кветачныя галоўкі бяз цыбалак і сушаць у цяньку; гэтак сама сушацца і лісьця, якія можна зьбіраць праз усё лёта, да жніўня. Часам зьбіраюць і карэньні рана вясною. Найбольшае застасаваньне маюць лісьця.

Ялавец. Шпількова куст. Расьце ў сухіх лясох на пясках. Цьвіце ў красавіку. Ягады яго з пачатку зялёныя ў восені робяцца цёмна-сінімі і дасьпяваюць толькі на другі год. Зьбіраюцца сьпелыя ягады ўвосені, або вясною. Сушацца ў цяньку.

Крушына. Куст ад 1 да 3 мэтраў вышыні, з гладкімі галінкамі; лісьця элептычныя, кветкі дробныя зялёна-жоўтыя, зьяўляюцца ў траўні і чэрвені. Ягада вялічыні гароху, з пачатку зялёная пасьля чырвоная, а ў канцы чорная. Расьце крушына ў вільготных, цяністых зарасьлях. Кара крушыны зьбіраецца вясною, найлягчэй і наляпей з старэйшых кустоў. Зьдзіраюць яе паскамі ўшырыню 1 цм-ра і крышаць у квадраты. Запатрэбаваньне вялікае—дзесяткі вагонаў.

Бедрыцкі.

Варагі і дабрадзеі ў сельскай гаспадарцы.

Прышла вясна. Прыляцелі з далёкіх краін птушкі, павыпаўзалі з месц зімоўкі жабы, вужакі; вылецялі кажаны, замятусіліся мышы. Усё пачынае жыць поўным жыцьцём. Чалавек жа разглядае кожную жывёліну ці збоку яе карысьці, ці шкоды. Асабліва гэта цікава для сельскіх гаспадароў. Трэба сказаць, што нашы гаспадары часта маюць тут неправілловы пагляд і трымаюцца варожа ці вядуць барацьбу там, дзе жывёліна заслугоўвае прыхільнасьці і падзякі.

Робіцца гэта таму, што селянін—гаспадар не заўсёды ведае, якая жывёліна прыносіць карысьць і якая шкодзіць. Так, да вядомай усім жабы, хоць ня пекнай на выгляд, але вельмі карыснай, гаспадар заўсёды трымаецца варожа. Другі прыклад. Усім вядома, што вясковыя дзеці за адно лета прыносяць птушкам больш шкоды, чым усе яго натуральныя ворагі за цэлы год. І ніхто ім гэтага не забараняе. Замест таго, каб стварыць спрыяльныя варункі, напрыклад, для такіх птушак, як шпак, ластаўка і г. д. дзеці сваімі адносінамі адганяюць птушку ад свайго будынку, саду, гароду. Больш таго, сяляне часта глядзяць на разбурэньне птушыных гнёзд дзецьмі, як на няшкодную забаву.

А між тым, гаспадар не зьвяртае ўвагі на шмат якіх шкоднікаў. Так, вядома, што мыш ня больш церпіць ад гаспадара, чым кажан, ці тая-ж самая жаба, ястраб, начная сава. Усіх іх селянін пры ўсялякім выпадку забівае. І гэта ў той час, калі мыш і ястраб зьяўляюцца ворагамі гаспадара, а начная сава, жаба, кажан—яго дабрадзеі.

Гаспадары Амэрыкі добра ўцямілі карысьць, якую прыносяць гаспадару большасьць палявых птушак і ня толькі не вядуць з імі барацьбы, а стараюцца прывабіць іх да сваіх садоў, гародаў, палёў, сенажацяй. Як бачым, і тут нам можна браць прыклад з заморскіх стран. Трэба зразумець, што шпак, ластаўка, дрозд, сініца, стрыж, начная сава, кажан, жаба, вожык і інш. — ёсьць дабрадзеі селяніна.

Усе яны зьнішчаюць нязьмерны лік усялякае машкары, жукоў, чарвей, вусеняў, а начная сава і вожык—мышэй. Усе яны прыносяць чалавеку няпрыметную, але вельмі значную карысьць. А гэта значыць, што ня толькі сам гаспадар не павінен забіваць іх, а наадварот бараніць і ад сваіх дзяцей.

Справа, здаецца, заслоўгоўвае таго, каб яе парушыць. Ні асобных сродкаў, ні шмат часу яна не вымагае.

Як.

Яшчэ адзін даход у гаспадарцы *).

Кожны з гаспадароў павінен рупіцца, каб, як мага, павялічыць свае мізэрныя даходы, і вось, адным з такіх пабочных даходаў у вёсках, будзе зьбіраньне ляснога насеньня г. зн. насеньня з соснаў, ёлак, дзікіх ігруш і яблыняў. Калі прыгледзіцца цэнам, якія плацяць за гэта насеньне, дык пабачым, што яны даволі вялікія і тое хай заахвоціць да яго зьбіраньня. І так за насеньне сасны—20—25 злот. за 1 кіляграм; за насеньне ёлкі — 8—10 злот.; ігрушы дзікай—45—50 злот.; яблыні дзікай—25—30 злот.

Дзеля збору насеньня сасны ды ёлкі трэба набраць з гэтых дрэў сьпелых шышак, каб толькі ня былі раскрытыя і старыя, і кожную партыю іх павесіць паасобку над печкай у палатняных мяшках, тады ад цяпла шышкі раскрываюцца, а ўстрасануўшы мяшком, насеньне з іх высыплецца на дно мяшка, адтуль яго вынімаюць і складаюць у сухім мейсцы, а мяшкі ізноў вешаюць, каб дарэшты ўсё насеньне з шышак высыпалася; паўтараюць гэтую працэдуру некалькі разоў, каб выбраць усё насеньне дачыста. Ігрушы дзікі і яблыні дзікі (фрукты) зьбіраюць паасобку ды гнояць іх, як кожнае згніе ў масу (трэба толькі берагчы ад мышэй), насеньне вымываюць вадой і аддзяляюць на сітах ад гнілой масы. Пасьля яго прасушываюць на рэдкай ткані, ці сітах на вольным паветры, у хаце над печкай і складаюць у сухім мейсцы ў палатняныя мяшкі. Кожнае насеньне лягчэй прадаць, калі яго многа, дзеля таго трэба старацца набраць яго, як мага, балей, ды некалькі кіляграмаў кожнага сорту, калі гэта ня ўдасцца, дык пры прадажы злучаюцца некалькі гаспадароў разам. Нясеньне гэтае купцы купляюць толькі сьвежае тагагоднае, у якім было сабрана. Прадаць яго можна большым насенным крамамам у Вільні, Горадні, Варшаве, куды трэба напісаць ці пры аказіі завясьці насеньне самім.

---

*) Матэрыял да стацьці часткай узят з „Tygodnika Rolniczego“ № 1—2—1926 г.

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.